**1 варыянт**

**1. Выпішыце нумары спалучэнняў слоў, якія не адносяцца да словазлучэнняў.**

1. Спалучэнне аднародных членаў сказа.
2. Склонавая форма назоўніка з прыназоўнікам.
3. Спалучэнне двух самастойных слоў з прыназоўнікам.
5. Складаная форма ступені параўнання прыслоўяў.
6. Састаўныя лічэбнікі.
7. Састаўныя прыназоўнікі.
8. Састаўныя злучнікі.

10. Азначаемае слова ў спалучэнні з адасобленым членам сказа.

**2. Дзве групы словазлучэнняў сфарміраваны па прымеце спосабу падпарадкавальнай сувязі. Падкрэсліце словазлучэнні, якія не адпавядаюць спосабу сувязі.**

| | |
|---|---|
| Хадзіў у ягады.<br>Прыгожы з выгляду<br>Віншаваць таварыша.<br>Прыемнае пачуццё<br>Промні сонца | Хадзіў павольна<br>Прыгожы па-свойму.<br>Віншаваць па-сяброўску.<br>Прыемна ўсведамляць<br>Сонечныя промні. |

**3. Выпішыце нумары словазлучэнняў.**

| | |
|---|---|
| 1. Добрая вестка. | 2. Каля дуба. |
| 3. Кроплі дажджу. | 4. Нізка над лесам. |
| 5. Будзем думаць. | 6. Сорак пяць. |
| 7. Найболып цікавы. | 8. Дабро і зло. |
| 9. Паўтараць бясконца. | 10. На працягу дня. |

**4. Выпішыце нумары словазлучэнняў, якія адпавядаюць схеме: галоўнае слова + залежнае слова.**

1. Надыход свята.
2. З дупла вылецець.
3. Аб'яву павесіць.
4. Ісці па лесе.
5. Прыгожыя школы.
6. Поспехі касманаўтыкі.
7. Выразна чытаць.

**5. Вызначце від падпарадкавальнай сувязі.**

1. Дарагі падарунак.
2. Дарагі чалавеку.
3. Багаты баравікамі.
4. Багаты ўраджай.
5. Бадзёры настрой.
6. Бадзёры з выгляду.
7. Вольны ад заняткаў.

**6. Выпішыце нумары словазлучэнняў з граматычным значэннем дзеяння і прадмета, на які яно пераходзіць.**

| | |
|---|---|
| 1. Запомніць | нумар |
| 2. Многа | грошай |
| 3. Песню | напісаў |
| 4. Сябра | падмануць |
| 5. Аб'ём | чайніка |
| 6. Запрасіць | гасцей |

**7. Знайдзіце памылкі ў дапасаванні галоўнага і залежнага слова, выпраўце іх.**

1. (запісаць) дзесятковую дроб —
2. (захапляцца) Аленчынай вучонасці —
3. (хадзіць па) лясным сцежкам —
4. (любавацца) шырокім стэпам —
5. (выслухаць) разумнага чалавека —
6. (пляснуць) сваёй далонню —
7. (бачыць) вялікага жука —

**8. Знайдзіце памылкі ва ўказанні спосабу сувязі слоў у словазлучэннях, адзначце іх.**

| | |
|---|---|
| 1. [К.] Крыўда на суседзяў | 2. [Д.] Пакрыўдзіўшы суседзяў |
| 3. [Д.] Пакрыўджаныя суседзі | 4. [П.] Любіў крыўдзіць |
| 5. [К.] Не даравaў крыўды | 6. [П.] Цяжка пакрыўдзіць |

**9. Запішыце з дадзеным словам тры словазлучэнні, з рознымі спосабамі сувязі.**

Вільготны.

10. **Адзначце нумары словазлучэнняў, якія могуць адначасова ўжывацца як свабодныя, так і несвабодныя.**

1. Віляць хвастом.
2. Закручваць гайкі.

3. Вады не замуціць.

**2 варыянт**

**1. Дзве групы словазлучэнняў сфарміраваны па прымеце спосабу сінтаксічнай сувязі. Падкрэсліце тыя словазлучэнні, якія не адпавядаюць спосабу сувязі.**

1. Мастацкае ткацтва. Паўночнае ззянне. Пад старой ялінай. Дзесяты нумар. Патрэбны самому.
2. Страціў надзею. Цягнуцца да сонца. Перапляліся ўверсе. Нумар вагона. Звялы ад спёкі.

**2. Выпішыце нумары словазлучэнняў, якія адпавядаюць нормам беларускай мовы.**

1. Выбачайце мне.
2. Дзякаваць брата.
3. Дзякаваць брату.
4. У пяці кіламетрах ад дома.
5. Два летніх дні.
6. За пяць кіламетраў ад дома.
7. Два летнія дні.
8. Выбачайце мяне.

**3. Змяніце словазлучэнні такім чынам, каб галоўнае і залежнае словы былі выражаны назоўнікамі.**

1. Матчыны клопаты —
2. Жураўліны крык —
3. Сардэчныя сасуды —
4. Вячэрні Мінск —
5. Кніжная шафа —

**4. Вызначце спосаб падпарадкавальнай сувязі і сфармулюйце сцвярджэнне.**

Пры (дапасаванні, кіраванніні) залежнае слова(змяняецца, не змяняецца) услед за галоўным, ставіцца ў тым жа (ліку, родзе, склоне), што і галоўнае.

Пры (кіраванні, прымыканні) залежнае слова (змяняецца, не змяняецца) услед за галоўным, а застаецца ў тым жа склоне, якога патрабуе ад яго галоўнае слова.

**5. Выпішыце нумары словазлучэнняў з падпарадкавальнай сувяззю.**

1. Чырвоная ружа.
2. Чырванее рабіна.
3. Чырванець ад сораму.
4. Чырвоны і белы.
5. Чырванаватыя яблыкі.
6. Чырвань захаду.
7. Чырвоным быць.

**6. Выпішыце нумары словазлучэнняў, якія адпавядаюць схеме: залежнае слова + галоўнае слова.**

1. Большасць вучняў.
2. Велічынёй з яблык.
3. Сястрына кніга.
4. Дарога за лесам.
5. Крыху павесялець.
6. Радавацца вясне.
7. Рана пасаджаны.

**7. Вызначце від падпарадкавальнай сувязі.**

1. Аматар гуляць.
2. Ручэй пераскочыць.
3. Работаю захапляцца.
4. Імкненне радавацца.
5. Здарэнне расказаць.
6. Вады прынесці.
7. Жаданне вучыцца.

**8. Запішыце з дадзеным словам тры словазлучэнні, з рознымі спосабамі сувязі.**

Стомлены

**9. Выберыце патрэбную граматычную форму, залежнага слова.**

1. Кроплі (дожджу/дажджа) ______________________________.
2. Нарач (сіні/сіняя) ________________________________.
3. Медаль (залатыы/залатая) ____________________________ .
4. Захварэць (грыпам/на грып) __________________________ .
5. Падобны (на маці/да маці) ______________________________.
6. Цюль (прыгожы/прыгожая) __________________________ .

**10. Выпішыце нумары несвабодных словазлучэнняў.**

1. На сёмым небе.
2. На сёмым паверсе.
3. Белая варона.
4. Ахілесава пята.
5. Развязаць хустку.
6. Развязаць язык.